**К. А. Сасноўская**

# ЯДЗЕРНА-ПЕРЫФЕРЫЙНЫЯ АДНОСІНЫ Ў СІСТЭМЕ РЭГІЯНАЛЬНАЙ ПРОЗВІШЧНАЙ АНТРАПАНІМІІ (на матэрыяле антрапанімікону Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці)[1]

Публікацыя прысвечана выяўленню семантычных асаблівасцей рэгіянальнай прозвішчнай сістэмы. Матэрыялам для даследавання паслужылі антрапанімiконы сямі найбольш буйных неселеных пунктаў Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці. Праводзіцца супастаўляльна-тыпалагічны аналіз семантычных асаблівасцей прозвішчаў, на аснове ядзерна-перыферыйных адносін вызначаюцца галоўныя заканамернасці развіцця рэгіянальнай антрапанімічнай сістэмы. Робіцца вывад аб тым, што галоўнай тэндэнцыяй іменавання чалавека на тэрыторыі Бешанковіччыны з'яўляюцца знешнія прыкметы. Частотнасць бытавання адапелятыўных прозвішчаў указвае на наяўнасць вузкаспецыяльных, рэгіянальных промыслаў.

Вывучэнне семантычных асаблівасцей прозвішчаўтваральных асноў дае шырокія магчымасці для выяўлення нацыянальна-культурных асаблівасцей народа. Асновы даследаваных антрапонімаў нясуць у сабе інфармацыю аб духоўнай і матэрыяльнай культуры народа, звычках, моўных узаемасувязях, што дазваляе наблізіцца да выяўлення моўнай карціны свету.

Асаблівасці этымалогіі прозвішчаў сямі населеных пунктаў Бешанковіцкага раёна варта разглядаць праз семантычнае поле. Тэрмін *поле* ўпершыню ўжыў Г. Іпсан ў 1924 г. Пад гэтым паняццем ён разумеў пэўную тэматычна арганізаваную групу слоў. Поле – вобласць існавання паняццяў ці слоў, якія цесна звязаны паміж сабой [цыт. па 1, с. 277]. Сярод даследчыкаў рускай анамастыкі полевага падыходу прытрымліваліся В. І. Супрун, Д. Б. Лугавы. Поле ўключае ў сябе ядро, каляядзерную прастору і перыферыю. Імёны, якія ўваходзяць у пэўнае лексічнае поле, уяўляюць сабой сістэму (ці комплекс сістэм), кожны член якой звязаны з іншым па розных параметрах: тэрыторыя, час, тэма [1, с. 281]. Таму разгляд прозвішчаў адносна семантычных палёў уяўляецца нам больш мэтазгодным і дазволіць больш тонка прааналізаваць асобныя группы антрапонімаў, у адрозненне ад аналізу з дапамогай лексіка-семантычных груп, дзе кожная з якіх аб'яднана некалькімі семамі.

Мэта дадзенай працы – супастаўляльна-тыпалагічны аналіз семантычных асаблівасцей прозвішчнай сістэмы Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці. У якасці матэрыялу для даследавання абраны антрапанімiконы 7 найбольш буйных неселеных пунктаў названага рэгіёна. Агульная колькасць даследуемых адзінак – 2600.

Семантычныя асаблівасці функцыянавання прозвішчных адзінак Бешанковіччыны мы разглядаем праз ядзерна-перыферыйныя адносіны. Каб супаставіць, як працуе рэгіянальная палевая мадэль ў адносінах да ўсёй

[1] Работа выканана пры фінансавай падтрымцы БРФФД (№ дзяржрэгістрацыі 20142540 ад 10.10.2014)

тэрыторыі Віцебскай вобласці, пры даследаванні семантычных асаблівасцей прозвішчаў мы пойдзем услед за Г. К. Семяньковай, якая ў сваім даследаванні таксама прытрымліваецца полевага падыходу [2]. Па дадзеных нашага матэрыяла *ядро* складаюць адапелятыўныя прозвішчы; *каляядзерную прастору* – антрапонімы, якія ўтварыліся ад уласных асабовых імён; *перыферыю* – адтапанімныя прозвішчы.

Ядро семантычнага поля фарміруюць прозвішчы, утвораныя ад *nomina personalia* і *nomina impersonalia.*

Мікраядро "Прозвішчы, утвораныя ад nomina personalia" ўключае 848 адзінак, што складае 52 % ад кампанентаў ядра. Сюды ўваходзяць антрапанімныя адзінкі, утвораныя шляхам трансанімізацыі былых мянушак, што ўзніклі ад апелятываў, якія характарызуюць чалавека ў *фізічным і псіхічным стане*; указваюць на *занятк*і, *прафесію, сацыяльны стан*; называюць асоб па *этнічнай і нацыянальнай прыналежнасці*; адлюстроўваюць *сямейны стан, абставіны з'яўлення дзіцяці* ў сям'і і *адносіны да яго бацькоў*; указваюць на *ўмовы з'яўлення чалавека* ў населеным пункце.

Кожная група мікраядра адрозніваецца колькасцю антрапонімаў, што дае магчымасць прасачыць, якім чынам фарміраваліся прозвішчныя тыпы на тэрыторыі Бешанковіцкага раёна. Бо, як заўважае Г. К. Семянькова, не кожнай лексеме ўласціва здольнасць вылучаць чалавека з пэўнага кола людзей. Асабовым іменем становіцца толькі той апелятыў, які ў дадзены час вызначаецца дастатковай ступенню індывідуалізацыі [2, с. 113].

Група "Прозвішчы, утвораныя ад мянушак, якія характарызуюць чалавека ў фізічным і псіхічным стане" найбольш шматлікая ў дадзенай зоне ядра і налічвае 60 % ад агульнай колькасці апелятываў. Яе складаюць адзінкі, суадносныя з апелятывамі, што характарызуюць асобу па

– росце і структуры цела: *Высачэнка, Вялічка, Галаванаў* ← *галаван* 'галаваст', *Караткоў, Малюцін, Талстой, Худобенка*;

– узросце: *Маладчонак, Маліц, Мальцаў, Старушэнка*;

– колеравых прыкметах: *Краско* ← *краско* 'чырвонашчокі, здаровы чалавек', *Краснікаў* ← *краснік* 'прыгожы, чырвоны', *Седнеў* ← рэгіян. *сядун*;

– асаблівасцях частак цела і фізічных недахопах: *Бізюк* ← рус. *бизой* 'сляпы', *Бяззубенка, Горбач, Крываносаў, Курносаў, Шчарбялёў*;

– асаблівасцях гаворкі: *Гаварушкін, Піскун, Сапелка, Шакін* ← *шака* 'той, хто шапяляе, вымаўляе гук [ш] замест іншых гукаў', *Хрыпценка*;

– асаблівасцях руху: *Баўтовіч, Вялы, Прыгун,Чэпік* ← памянш. *чэпік* ← *чэпа* "той, хто хапае", *Хадуноў, Храмцоў*;

– разумовых здольнасцях: *Дзябёлы, Дуранаў, Мазго, Размыслоў, Разумаў*;

– рысах характару: *Брыль* ← *брыль* 'ілгун', *Падкавыраў, Шчадроў*;

– адносінах да працы: *Будаеў, Працанаў, Умецкі.*

Аналізуючы дадзеную групу, можна заўважыць, што сярод прозвішчаў, утвораных ад nomina personalia, амаль на ўсёй даследаванай тэрыторыі пераважаюць антрапонімы, якія паходзяць ад мянушак, што

характарызуюць чалавека па знешніх прыкметах. Калі ўвогуле параўноўваць усе групы, то па колькасці прозвішчаў названая група займае першае месца. Самымі буйнымі населенымі пунктамі па колькасці такіх антрапонімаў з'яўляюцца вёскі Свяча і Верхняе Крывіна – 28,1 і 22,1 % адпаведна. Менш за ўсё іх налічваецца ў г.п. Ула – 17,5 %.

Група "Прозвішчы, суадносныя з мянушкамі, што ўзыходзяць да апелятываў, якія абазначаюць заняткі, прафесію, сацыяльны стан", можа захоўваць інфармацыю па наступных паказчыках:

– промысел, рамяство: *Алейнік, Бандарэнка, Вінакураў, Ганчароў, Кавалёў, Кравец, Кузняцоў, Прасулаў* – ад *прасул* 'салявар', *Пушкар, Ткачонак, Токараў, Чыканшчык, Шыцько*;

– сельская гаспадарка, жывёлагадоўля: *Жаўняронак, Конюхаў, Мельнікаў*;

– лясніцтва, паляванне, рыбалоўства: *Рыбак, Рыбачок, Мясаедаў*;

– гандлярства: *Ганчароў, Калеснікаў*;

– воінская служба: *Войтаў, Камандзірчык, Рыцараў, Салдаценка*;

– сацыяльны стан: *Багач, Беднякоў, Кароль, Князеў, Прынц, Слуга, Царык*;

– іншыя: *Каморнік, Кухто ← кухта, кухцік* 'прыслужнік, вучань повара'.

Прозвішчы, утвораныя ад назваў прафесій, даюць магчымасць больш дэталёва разгледзець асаблівасці некаторых антрапонімаў. Большую іх колькасць этымалагічна можна лёгка зразумець (*Аўчыннікаў* – ад *аўчыннік* 'гарбар', *Бондараў, Каваленка*), а вось семантыка асобных з першага погляду здаецца незразумелай (*Буднік* – ад *буднік* 'смалакур', *Кухто* – ад *кухта* 'кухар', *Чумакоў* – ад *чумак* 'ездавы'). Сярод дадзенай групы намінацый пераважаюць групы антрапонімаў, якія адносяцца да рамяства і воінскай службы – 40 % ад агульнай колькасці прозвішчаў дадзенай групы.

Група "Прозвішчы, утвораныя ад мянушак, што ўзыходзяць да апелятываў, якія называюць асоб па этнічнай і нацыянальнай прыналежнасці" – нешматлікая і налічвае ўсяго 38 адзінак: *Калмык, Карэлін, Латышаў, Літвінаў, Лях, Маскаленка, Палішчук, Севярынаў, Цыганкоў, Швед, Хахлоў, Якуценка* і інш. У такіх вёсках, як Верхняе Крывіна і Дразды, гэты тып увогуле адсутнічае. Найбольш такіх адзінак зафіксавана намі ў г.п. Бешанковічы – 18, што складае амаль палову ад агульнай колькасці онімаў гэтай групы. Дадзеную з'яву можна патлумачыць цэнтральным месцазнаходжаннем паселішча, большай колькасцю насельніцтва і актыўнымі міграцыйнымі працэсамі.

Група "Прозвішчы, утвораныя ад мянушак, што ўзыходзяць да апелятываў, якія суадносяцца з сямейным станам, абставінамі з'яўлення дзіцяці ў сям'і і адносінамі бацькоў да яго" складае 5 %: *Адзінцоў, Дзядзечкін, Дзедзянкоў, Мачыха, Радной, Сваток.* У прозвішчах, што суадносяцца з апелятывамі, якія абазначаюць абставіны з'яўлення дзіцяці ў сям'і, увасобіліся розныя паняцці: чарговасць нараджэння дзіця: *Траццякоў, Пяткевіч, Пятко*; сацыяльны стан асобы: *Сіроткін*; адносіны да яго бацькоў: *Жданаў, Ждановіч, Пазняк, Родчанка.*

Група “Прозвішчы, утвораныя ад мянушак, што ўзыходзяць да апелятываў, якія адлюстроўваюць асаблівасці з’яўлення чалавека ў населеным пункце” ўключае такія адзінкі, як *Новік, Новікаў.* Названыя онімы маюць аснову *новы*, што значыць ‘новы, які раней не пражываў у гэтай мясцовасці’. У сярэднім такія адзінкі складаюць 1 % ад агульнай колькасці сямейных антрапонімаў. Прыведзеныя дадзеныя амаль супадаюць з паказчыкамі па Віцебшчыне, дзе прозвішчаў дадзенага тыпу налічваецца таксама 1,2 % [3, с. 237]. На суседняй расійскай Раслаўльшчыне прозвішча *Новікаў* уваходзіць у першую дзясятку па ўжывальнасці [4, с. 22].

Мікраядро “Прозвішчы, утвораныя ад nomina impersonalia” займае 48 % ядзернай прасторы. Узніклі яны ад мянушак, што ўзыходзяць да апелятываў, якія называюць *прадметы (адзінкі флоры і фаўны); часткі цела чалавека; абстрактныя паняцці; харч; рэлігійныя тэрміны; з’явы прыроды і часавыя паняцці; рэчывы; грашовыя адзінкі і адзінкі вымярэння.*

Група “Прозвішчы, утвораныя ад мянушак, што ўзыходзяць да апелятываў, якія называюць прадметы” налічвае 166 антрапонімаў (20 %). На Віцебшчыне гэты тып онімаў самы прадуктыўны і складае амаль 30 %. Яны ўключаюць антрапанімныя адзінкі, што маюць адносіны да быту чалавека, ладу яго жыцця. Апелятывы, з якімі яны суадносяцца, вельмі разнастайныя па семантыцы. Яны маглі абазначаць

– прадметы быту, посуд: *Бадзьіна* – рус. ад *бадья* ‘шырокае нізкае драўлянае вядро’, *Берасцень* – ад *берасцень* ‘гаршчок, аплецены бяростаю’, *Гузь* – ад *гуз* – ад *вузел* ‘завязаная верхняя частка мяшка’, *Прышчэпаў, Чаранок*;

– прылады працы і іх часткі: *Гайко, Гвоздзь, Кручкоў, Скобаў, Скрабло*;

– адзенне, абутак, іх часткі: *Кіцар, Лапатнеў, Сарафанаў, Шапанька, Шапо*;

– музычныя інструменты: *Дудкін, Скрыпкін, Скрыпчанка, Смычкоў, Трубовіч*;

– зброю і ваенныя атрыбуты: *Саблін, Шаблін.* У г.п. Бешанковічы і в. Астроўна назіраецца самая вялікая колькасць прозвішчаў дадзенага тыпу – 11 і 8 % адпаведна. У астатніх жа населеных пунктах іх налічваецца ў сярэднім каля 4 %.

Група “Прозвішчы, утвораныя ад мянушак, што ўзыходзяць да апелятываў, якія адносяцца да флоры і фаўны” па колькасці кампанентаў таксама вельмі значная. Большасць прозвішчаў, утвораных ад апелятываў, якія адносяцца да фаўны, з’явілася ад унутрысямейных імёнаў і мянушак, якія ў сваю чаргу ўзніклі на базе апелятываў – назваў жывёл, что першапачаткова адлюстроўвалі знешнасць і характар чалавека [5, с. 116]. Антрапонімы, што ўтварыліся ад апелятываў расліннага свету, могуць суадносіцца з назвамі

– дрэў: *Асінавік, Вербалоз, Дубінец, Дубчонак, Калінін, Ліпаў*;

– кустоў, траў: *Анісовіч, Канапелька, Кустоў, Цвяткоў*;

– раслін, якія культывуюцца чалавекам: *Буракоў, Гарох, Грачыха*;

– грыбоў: *Баравік, Валуй, Грыб, Махавік, Махавікоў*;

– пладоў і частак раслін: *Арэшчанка, Качан, Колас, Калоскін, Маліна.*

Назвы жывёл і птушак адносяцца да ліку адзінак, якім уласцівы высокі антрапанімны каэфіцыент. Гэта звязана, па-першае, з шырокімі магчымасцямі адзначаных лексем персаніфікавацца; па-другое, з захаваннем традыцый татэмізму, пры якім абагатвораныя жывёлы (як і птушкі, расліны, з'явы прыроды) лічыліся родапачынальнікамі племені. У гэтай падгрупе адлюстраваны назвы наступных прадстаўнікоў фаўны:

– дзікіх звяроў: *Барсукевіч, Зайцаў, Кабанаў, Лосіч, Мядзведзеў, Суркоў*;

– свойскіх жывёл: *Баранаў, Быкаў, Казлоў, Казунька, Козік, Цялюк* (ад *цяля*);

– дзікіх птушак: *Арлоў, Дзяцел, Драздоў, Кукушкін, Лебедзеў, Чайка*;

– свойскіх птушак: *Петушкоў, Петухоў*;

– насякомых: *Блохін, Жук, Жукаў, Камароўцаў, Кузнечык, Мураўёў, Муха*;

– рыб, паўзуноў і іншых жывых істот: *Карасёў, Карпаў, Чарвякоў, Яршоў.*

Група прозвішчаў, утвораных ад мянушак, што ўзыходзяць да апелятываў, якія адносяцца да флоры і фаўны, з'яўляецца самай пашыранай у структуры дадзенага мікраядра. Прычым група антрапонімаў, што суадносяцца з назвамі дзікіх птушак – найбольш папулярная.

Невялікая па колькасці адзінак група "Прозвішчы, утвораныя ад мянушак, што ўзыходзяць да апелятываў, якія абазначаюць ч а с т к і ц е л а ч а л а в е к а". Большасць з іх зарэгістравана ў в. Астроўна (3 %), г.п. Ула (2,6 %) і г.п. Бешанковічы (3 %): *Глазкін, Зубец, Лапенкаў, Усаў, Чэрапаў.*

У групу "Прозвішчы, утвораныя ад мянушак, што ўзыходзяць да апелятываў, якія абазначаюць а б с т р а к т н ы я п а н я ц ц і" ўваходзяць такія антрапонімы, як *Пажарын, Смерцьеў, Шэлест* і іншыя. Па колькасці гэты сектар нешматлікі. У сярэднім кожны населены пункт налічвае па 3 сямейныя антрапонімы, толькі ў цэнтры Бешанковіцкага раёна іх зафіксавана 21 адзінка, што складае 1,8 % ад агульнай колькасці прозвішчаў.

"Прозвішчы, утвораныя ад мянушак, што ўзыходзяць да апелятываў, якія суадносяцца з х а р ч а м" даюць магчымасць грунтоўнага асэнсавання характару ежы ў кожнай мясцовасці, бо, як вядома, раней харчаванне займала значна большае месца ў жыцці нашых продкаў: *Аладзьеў, Аўсянкін, Бабаедаў, Баранак, Блінаў, Кісялёў, Куляшоў, Куцця, Малакоў, Пышкін, Сальнікаў, Сухараў, Смятанін.* З прыведзенага рада бачна, што галоўнай асаблівасцю харчавання было ўжыванне натуральнай ежы.

У групу "Прозвішчы, утвораныя ад мянушак, што ўзыходзяць да апелятываў, якія адносяцца да р э л і г і й н ы х п а н я ц ц я ў" уваходзяць наступныя адзінкі: *Званкоў, Кляшторны* (ад *кляштар* 'каталіцкі манастыр' ), *Крастоўскі, Небажэнка, Паповіч, Рэут* (ад *рэут* 'вялікі звон на званіцы'). Па колькасці такія антрапонімы пераважаюць у г.п. Ула (2 %) і г.п. Бешанковічы (1,7 %). У в. Верхняе Крывіна названых прозвішчаў увогуле не зафіксавана.

Аналізуючы групу "Прозвішчы, утвораныя ад мянушак, што ўзыходзяць да апелятываў, якія апісваюць з'я в ы п р ы р о д ы", можна даведацца пра прыродныя з'явы, на якія найперш звярталі ўвагу нашы продкі: *Аблакоў,*

*Громаў, Мароз, Мяцеліца, Туманаў, Холад.* З пэўнай доляй умоўнасці да антрапонімаў гэтага сектара можна далучыць таксама прозвішчы, якія паходзяць ад назваў часавых паняццяў: *Зімніцкі, Летка, Пятніца.*

Група "Прозвішчы, утвораныя ад мянушак, што ўзыходзяць да апелятываў, якія называюць рэчывы" ўключае наступныя найменні: *Воднеў, Дзеравяшка, Жалезка, Крэйда, Леднік, Серабро, Шавяка* (ад *шавяка* 'жывёльны памёт').

Нешматлікай па колькасці прозвішчаў з'яўляецца група "Прозвішчы, утвораныя ад мянушак, што ўзыходзяць да апелятываў, якія называюць грашовыя адзінкі і адзінкі вымярэння". У яе склад уваходзяць толькі 5 адзінак, напрыклад, *Грош, Кладаў, Шастаковіч ← шастак* 'алтын, манета вартасцю ў 6 медных капеек' (0,2 % ад усёй колькасці антрапонімаў).

Этымалагічна прозвішчы не маюць наўпрост адносін да яе сучасных носьбітаў, гэта толькі ідэнтыфікацыйныя знакі з рэдукаванай семантыкай, прымальныя ў сілу традыцый. Жывы іх сэнс быў актуальны толькі ў момант з'яўлення і прызначаўся самаму першаму носьбіту. Прозвішча характарызавала толькі яго родапачынальніка, а пры пераносе на дзяцей, унукаў яго спрадвечнае значэнне спачатку зацямнялася, а потым забывалася [6, с. 10].

Каляядзерную прастору складаюць прозвішчы, утвораныя ад уласных асабовых імён (25 % ад агульнай колькасці намінацый). Інвентар адыменных прозвішчаў налічвае большасць намінацый з празрыстай прозвішчаўтваральнай асновай (*Барысаў ← Барыс*, *Дзмітрыеў ← Дзмітрый*, *Уладзіміраў ← Уладзімір* ), але ёсць і тыя, паходжанне якіх вызначаецца не адразу: *Амбражэвіч ←* рус. *Амвросий*, *Гур ← Гурый*, *Ладзік ← Ладзята* (*Уладзімір*). На даследаванай тэрыторыі пераважаюць прозвішчы, утвораныя ад імёнаў, якія цяпер не ўжываюцца ці фанетычна зменены. Намінацыі, якія паходзяць ад уласных асабовых імён, складаюць у г.п. Бешанковічы найбольшую колькасць: на іх долю прыпадае 26,3 % усяго антрапанімікону раённага цэнтра, прычым пераважаюць сярод іх мужчынскія (25,2 % у г.п. Бешанковічы; 23,9 % у в. Астроўна; 22,5 % у в. Свяча).

Каляядзерная прастора ўключае разнастайныя па характары прозвішчы, утвораныя ад традыцыйна-царкоўных, эмацыянальна-ацэначных, бытавых форм імён. Усю вялікую групу адыменных антрапонімаў можна падзяліць на прозвішчы, утвораныя ад каталіцкіх і праваслаўных імён. Антрапонімаў праваслаўнага паходжання ў сярэднім налічваецца 22 % (*Адаменкаў, Аляксееў, Васільеў, Ільюшэнка, Лукша, Фядзьковіч, Якаўлеў*). Большая частка такіх прозвішчаў бытуе ў г.п. Ула – 26 %; г.п. Бешанковічы – 25 %; в. Астроўна – 23,5 %. Радзей за ўсё яны сустракаюцца ў вёсках Бачэйкава і Дразды – 17,4 і 17 % адпаведна. Зафіксаваны наступныя намінацыі, якія ўзыходзяць да форм каталіцкіх імён: *Базылевіч, Барбарчык, Казмярчук, Каралёў, Сцефаненка, Тамашэвіч, Яцук*. Асобную групу складаюць прозвішчы, утвораныя ад размоўна-бытавых форм кананічных імён: *Васёха, Васько, Дашкевіч, Глебка, Малах, Масько, Пятрашка, Сімаха, Юрчак*. У антрапаніміконе Бешанковіцкага раёна асобна можна вылучыць проз-

вішчы, што ўтварыліся ад форм старажытных імён (4 %). У асноўным гэта адзінкі, якія паходзяць ад такіх імён, як *Барыс*, *Багдан*, *Барыслаў*, *Уладзімір*, *Яраслаў*: *Барысаў, Багдановіч, Барысевіч, Барысёнак, Валадзько, Валодзін, Ладзік, Ярошчанка.* Вядомы даследчык Б. В. Унбегаун увогуле адносіць прозвішчы, утвораныя ад форм імені *Богдан*, да мянушак, што ўзыходзяць ад апелятываў, якія апісваюць абставіны з'яўлення дзіцяці ў сям'і і адносіны да яго бацькоў. Вучоны тлумачыць імя Багдан як 'дзіця, дадзенае Богам' [7, с. 181].

Антрапонімаў, утвораных ад форм жаночых імён, у сярэднім каля 0,5%: *Галько, Дашчанка, Любачка, Танькоў.*

Прозвішчы неаднародныя па паходжанні: вылучаюцца сярод іх грэчаскія, лацінскія, яўрэйскія і інш. Большасць з іх утворана ад форм імён грэчаскага паходжання – 55 %: *Аляксееў, Васільеў, Грыгор'еў, Дзянісенка, Прохараў, Семянюга, Сцяпанаў, Філіпенка.* Другое месца займаюць намінацыі яўрэйскага паходжання, у сярэднім яны складаюць 18 % ад агульнай колькасці. Больш за ўсё іх зафіксавана ў г.п. Бешанковічы (16 %) і менш за ўсё ў в. Дразды (1 %): *Аврамаў, Захаранка, Іваноў, Малахаў, Матвейчык, Савельеў, Якубаў, Якушаў.* Трэцяе месца займаюць адзінкі, утвораныя ад форм лацінскіх імён, ім належыць 6 % ад агульнай колькасці: *Антонаў, Банадысенка, Косцюшаў, Лукашэнка, Маркевіч, Раманюк, Паўлаў, Фралоў.* На даследаванай намі тэрыторыі існуюць таксама антрапонімы персідскага паходжанння (*Дашкевіч ← Дашка ← Даша ← Дар'я*); польскага (*Казіміранка, Кароль, Карлюк, Тамашэвіч, Яцук* – ад Яцэк); арамейскага (*Варсанаў* – ад *Варсанофія*).

На перыферыі семантычнага поля знаходзяцца прозвішчы, утвораныя ад геаграфічных назваў. Іх удзел у структуры семантычнага поля невялікі – 11 %. Такія намінацыі ўтвараюцца ад імён, якія былі дадзены асобам у сувязі з месцам іх нараджэння, пастаянным месцажыхарствам і часцей за ўсё належалі вышэйшым колам грамадства. У Расіі такія намінацыі адносіліся да адной з груп найбольш старажытных прозвішчаў; некаторыя з іх датуюцца нават XIV стагоддзем, і доля дваранскіх і знатных прозвішчаў вельмі вялікая: *Вяземскі – Вязьма*, *Валконскі* – р. *Волконь*, *Курбскі* – в. *Ку'рба* на рацэ *Ку'рбіца* і г.д. [7, с. 106]. Асноўным паказчыкам дадзенага тыпу антрапонімаў з'яўляюцца суфіксы *-ец* і *-скі/-цкі.*

Найбольшая колькасць адтапанімічных намінацый назіраецца ў г.п. Бешанковічы – 42 %. Сюды ўваходзяць прозвішчы, што ўтварыліся не толькі ад ад назваў вёсак, але і ад назвы ракі: *Высагорац* ← в. *Высокая Гара*, Бешанковіцкі раён, *Камоска* ← в. *Камоскі*, Бешанковіцкі раён, *Тоўпінец* ← в. *Тоўпіна*, Чашніцкі раён, *Шуроўскі* – ад назвы ракі *Шура.* Адзначаюцца выпадкі, калі прозвішча можа быць матывавана дваяка: ці назвай той асобы, якой належала месца пражывання, ці тапонімам: З*абалоцкі* ← 'той, хто жыве за балотам', в. *Забалоцце.* У г.п. Ула налічваецца 28 % прозвішчаў, утвораных ад геаграфічных назваў. У іх склад уваходзяць таксама антрапонімы, што паходзяць ад тапонімаў, размешчаных за межамі Беларусі: *Самарын* ← ад *Самара* і *Усцюгаў* ← ад *Усцюг.* Наяўнасць антрапоніма *Полацкі*, які

зафіксаваны толькі на тэрыторыі г.п. Ула, відавочна, тлумачыцца паходжаннем перасяленца з Полацкай зямлі. Аналіз антрапанімікону г.п. Бешанковічы дазваляе асобна вылучыць прозвішчы, утвораныя ад назваў гарадоў: *Кобрынец* – ад *Кобрын*, *Магілёвец* – ад *Магілёў*.

Падсумоўваючы вынікі праведзенега даследавання, адзначым, што семантычнае поле прозвішчаў жыхароў Бешанковіцкага раёна складае ядро, дзе знаходзяцца прозвішчы адапелятыўнага характару (64 %), каляядзерная прастора, якую займаюць адыменныя прозвішчы (25 %), і перыферыя з адтапанімічнымі прозвішчамі (11 %). Ядро семантычнага поля фарміруюць прозвішчы, утвораныя ад nomina personalia і nomina impersonalia. Колькасныя паказчыкі кампанентаў ядра сведчаць аб нязначнай перавазе антрапонімаў першага мікраядра над другім, адкуль вынікае, што большасць прозвішчаў узнікла шляхам трансанімізацыі. Сярод прозвішчаў, утвораных ад nomina personalia, пераважаюць тыя, што характарызуюць чалавека ў фізічным і псіхічным стане (60 %) і ўказваюць на заняткі, прафесію, сацыяльны стан (29 %). Гэта гаворыць аб тым, што галоўнай тэндэнцыяй іменавання чалавека на Бешанковіччыне з’яўляюцца знешнія прыкметы. Частотнасць бытавання адапелятыўных прозвішчаў указвае на наяўнасць вузкаспецыяльных, рэгіянальных промыслаў: *Алейнік, Бондар, Вінакураў, Кузняцоў, Ткачонак*. Прозвішчы другога мікраядра – гэта адзінкі, утвораныя ад мянушак, што ўзыходзяць да апелятываў, якія называюць прадметы (20 %), адзінкі флоры і фаўны (46 %).

Каляядзерная прастора прадстаўлена адыменнымі антрапонімамі. Сярод іх пераважаюць прозвішчы, што суадносяцца з імёнамі праваслаўнага календара – 22 % ад усёй колькасці. Па паходжанні прозвішчы падзяляюцца на грэчаскія, лацінскія, яўрэйскія. Перыферыю семантычнага поля складаюць прозвішчы, утвораныя ад геаграфічных назваў. Аналіз адтапанімных намінацый паказаў, што большасць насельніцтва Бешанковіччыны – карэнныя жыхары. Акрамя прозвішчаў, утвораных ад назваў вёсак, на даследаванай тэрыторыі фіксуюцца прозвішчы, якія ўзніклі ад назваў гарадоў і рэк. Прозвішчы, утвораныя ад тапонімаў, – яркае сведчанне гістарычных міграцыйных працэсаў.

ЛІТАРАТУРА

1. *Суперанская, А. В.* Общая теория имени собственного / А. В. Суперанская; отв. ред. А. А. Реформатский. – 3-е изд., испр. – М. : Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2009. – 368 с.

2. *Семянькова, Г. К.* Прозвішчы жыхароў Віцебшчыны: структура, семантыка, геаграфія: аўтарэф. дыс. …канд. філал. навук. – Минск, 2002. – 21 с.

3. *Мезенка, Г. М.* Віцебшчына ва ўласных імёнах: мінулае і сучаснасць / Г. М. Мезенка, В. М. Ляшкевіч, Г. К. Семянькова. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2006. – 238 с.